ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
24 лістапада 2010 г. № 1719
Аб Рэспубліканскім грамадскім савеце па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь

У адпаведнасці з артыкулам 36 Закона Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 года «О Совете Министров Республики Беларусь» і ў мэтах далейшага развіцця і папулярызацыі нацыянальнай культуры і мастацтва
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:
1. Стварыць пастаянна дзеючы Рэспубліканскі грамадскі савет па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.
2. Зацвердзіць прыкладзеныя:
Палажэнне аб Рэспубліканскім грамадскім савеце па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
склад Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.
3. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

Прэм’ер-міністр Рэспублікі БеларусьС.Сідорскі

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
24.11.2010 № 1719

ПАЛАЖЭННЕ
аб Рэспубліканскім грамадскім савеце па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь

1. Рэспубліканскі грамадскі савет па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (далей – грамадскі савет) ствараецца ў мэтах забеспячэння больш шырокага ўдзелу творчай інтэлігенцыі ў ажыццяўленні дзяржаўнай культурнай палітыкі, аб’ектыўнай ацэнкі праблемных пытанняў і распрацоўкі канкрэтных мер па іх вырашэнню ў дзейнасці тэатральных, музычных і іншых калектываў мастацкай творчасці і арганізацый культуры.
2. Грамадскі савет з’яўляецца пастаянна дзеючым кансультатыўным органам, які забяспечвае ўзаемадзеянне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання, арганізацый культуры, грамадскіх аб’яднанняў.
3. Грамадскі савет у сваёй дзейнасці кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, дэкрэтамі, указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і іншымі актамі заканадаўства, у тым ліку дадзеным Палажэннем.
4. Асноўнымі задачамі дзейнасці грамадскага савета з’яўляюцца: падрыхтоўка прапаноў па вызначэнню накірункаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры і мер па яе рэалізацыі; удзел у падрыхтоўцы праектаў асноўных рашэнняў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры, нарматыўных прававых актаў па пытаннях культуры і мастацтва; падрыхтоўка прапаноў рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання аб паляпшэнні іх узаемадзеяння з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ў галіне культуры; прыцягненне творчых саюзаў, грамадскіх аб’яднанняў, фондаў, юрыдычных і фізічных

асоб да ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры і выпрацоўкі канкрэтных мер па яе рэалізацыі; удзел у падрыхтоўцы прапаноў на разгляд Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па пытаннях сацыяльнай абароны работнікаў культуры; садзейнічанне ў рэалізацыі найбольш значных культурных ініцыятыў, праграм і праектаў; развіццё і ўзмацненне міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне культуры.
5. Грамадскі савет для ажыццяўлення ўскладзеных на яго задач можа: звяртацца з ініцыятывамі па вырашэнню праблем сферы культуры ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы; запрошваць ва ўстаноўленым парадку неабходную інфармацыю ад арганізацый культуры; прыцягваць ва ўстаноўленым парадку для вырашэння праблемных пытанняў дзеячаў культуры, мастацтва, навукі, іншых спецыялістаў.
6. Члены грамадскага савета маюць права па запрашэнню прымаць удзел у рабоце калегіі Міністэрства культуры, іншых пасяджэннях па разгляду і вырашэнню пытанняў развіцця культуры.
7. Арганізацыйнае забеспячэнне дзейнасці грамадскага савета ажыццяўляе Міністэрства культуры.
8. Для прапрацоўкі пытанняў, падрыхтоўкі пасяджэнняў грамадскага савета, правядзення экспертных і аналітычных работ грамадскі савет можа ствараць пастаянныя і часовыя рабочыя групы, якія будуць дзейнічаць пад кіраўніцтвам аднаго з яго членаў.
9. Пасяджэнні грамадскага савета праводзяцца па неабходнасці. Пасяджэнні грамадскага савета правамоцныя, калі на іх прысутнічаюць больш паловы яго членаў. Члены грамадскага савета не маюць права перадаваць свае паўнамоцтвы іншым асобам. Рашэнні грамадскага савета прымаюцца простай большасцю галасоў адкрытым або тайным галасаваннем. Асабістае меркаванне членаў грамадскага савета, якія галасавалі супраць прынятага рашэння, выкладаецца ў пісьмовай форме і дадаецца да рашэння грамадскага савета. Кіруе пасяджэннямі грамадскага савета старшыня грамадскага савета, у яго адсутнасць – намеснік старшыні грамадскага савета.
10. Склад грамадскага савета зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.
11. Рашэнні грамадскага савета носяць рэкамендацыйны характар.
12. Члены грамадскага савета ўваходзяць у яго склад на добраахвотных пачатках.